Таким образом, пространство постоянной экспозиции «Белорусское искусство конца XIX – начала XXI века» посетителям Национального художественного музея Республики Беларусь дает возможность увидеть знаковые для белорусского искусства и наилучшие с художественной точки зрения произведения. Логика построения музейной экспозиции раскрывает выразительные особенности отечественной живописи в жанрах пейзажа, портрета, натюрморта, тематической картины. Выставленные в музейном пространстве, полотна представляют нашу родину в художественных образах, акцентируя внимание на географических и природных особенностях нашей страны, ее культурных достижениях, подчеркивают существование глубоких традиций народного творчества.

1. *Жук, В. И.* Живопись Беларуси на рубеже веков : потери и обретения / В. И. Жук. – Минск : Беларус. навука, 2013. – 159 с.

2. *Шарангові́ч, Н. В.* Гаўрыіл Вашчанка. Народжаны Палессем : нататкі пра жыццё і творчасць / Н. В. Шаранговіч. – Мінск : Маст. літ., 2008. – 256 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПЫТАННІ РЭЛІГІЙНАЙ АПАЛОГІІ Ў ЧАСОПІСЕ «ХРЫСЦІЯНСКАЯ ДУМКА» (1928–1939)

***М. В. Анцыповіч,***
*кандыдат філасофскіх навук,*
*дацэнт Універсітэта імя Ніла Гілевіча*

Сярод мноства ліберальных і хрысціянска-дэмакратычных партый і аб’яднанняў, якія дзейнічалі ў міжваеннай Польшчы (1921–1939), асобнае месца ў Заходняй Беларусі займала партыя Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (БХД), якая арганізацыйна аформілася ў Петраградзе ў маі 1917 г. Ідэйным

натхняльнікам і кіраўнікам беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў быў ксёндз касцёла Святога Мікалая ў Вільні Адам Станкевіч. На працягу свайго існавання (1919–1939) кіруючае становішча ў БХД займалі ксяндзы – беларусы В. Гадлеўскі, С. Грынкевіч, Я. Тарасевіч, П. Татарыновіч, В. Шутовіч. Афіцыйным друкаваным органам БХД з'яўлялася газета «Крыніца» (з 1926 г. – «Беларуская крыніца»), а таксама часопіс «Хрысціянская думка». Пад уплывам БХД знаходзіліся часопісы «Студэнцкая думка» і «Шлях моладзі». У агульнапалітычным плане БХД абгрунтоўвала палажэнні аб незалежнасці Беларусі, а самабытнасць беларускага народа ўяўлялася як здольнасць ісці сваім культурна-гістарычным шляхам, нягледзячы на ціск і супрацьдзеянне яму з боку акаляючых народаў і дзяржаў.

Першы нумар «Хрысціянскай думкі» выйшаў 6 студзеня 1928 г. у Вільні на беларускай мове ў лацінскай графіцы. Яе праграмны накірунак быў вызначаны дакладна: «хоць часопіс і выходзіць ў свет раздробленасці беларускай палітычнай думкі .. наша задача не стварэнне новай палітычнай партыі, а імкненне не дзяліць, не руйнаваць, а злучаць, будаваць і раскрываць святазарны ідэал Хрыстуса». Лейтматыў «Хрысціянскай думкі» раскрываўся ў вершаваным ўхваленні Бога: Прыйдзі Тварэц, Сьвяты к нам Дух, // Адведай мысьлі ўсіх людзей, // Напоўні сэрцы верных слуг // Праменьнем міласьці тваей //. Тыпалагічная мадэль часопіса складаецца з грамадска-палітычнага, філасофска-мастацкага, навукова-папулярнага, гісторыка-літаратуразнаўчага і сатырычнага блокаў. Структура публікацый «Хрысціянскай думкі» падпарадкоўвалася правілам каталіцкай флюрылёгіі (субардынацыі складання хрысціянскіх установак): спачатку выкарыстоўваюцца выказванні І. Хрыста, затым апосталаў, айцоў царквы і г. д. у храналагічным парадку. І толькі ў завяршэнні прыводзіцца разгорнуты аўтарскі каментарый, ствараючы такім чынам паралель паміж эпохай ранняга хрысціянства і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сучаснасцю. Змешчаны ў першым нумары часопіса эпіграф: «І зьбярэ сваю пшаніцу ў гумно, а пасьледкі спале агнём нязгасным» (Мац. 3:12) – праходзіць праз усю гісторыю часопіса. Ён прадвызначаў хрысціянскі жанр барацьбы дабра і ліха, у якой дабро, негледзячы на шматлікія падкопы і спакусы д’ябальскай сілы, возьме верх.

«Хрысціянская думка» разглядала рэлігію як неаддымную частку штодзённага жыцця чалавека і імкнулася сфарміраваць падобныя адносіны і ў чытача. Якасная публіцыстыка з аўтарскай пазіцыяй, культурны ўзровень, рэлігійна-папулярнае выкладанне матэрыяла характэрна для «Хрысціянскай думкі», у якой сітуацыя заўсёды была стабільнай: не чакалася ні спаду, ні выбуху чытацкай актыўнасці, «сваё», «правільнае» ў часопісе ўяўлялася больш важным, чым нейкае ўзнёслае, але чужое.

Часопіс практыкаваў цэлы арсенал прыёмаў у асвятленні феномена рэлігіі, яе сутнасці, уяўленняў, абрадавасці, традыцый: цытаванне крыніц, дыскусійныя спрэчкі, выкарыстанне эпісталярных сведчанняў, стварэнне іранічнага падтэксту. А гэта ўсё разам выяўляла дыхатамічнасць поглядаў, уяўленняў адносна рэлігійнай веры, да якой адносяцца не толькі царкоўныя дагматы, але і «мужыцкая вера» і «панскія пыхлівыя выдумкі», і новыя рэлігійныя плыні. Перадавыя артыкулы часопіса напоўнены павучальнымі парадамі аб неабходнасці ўцаркаўлення чалавека, якое і з’яўляецца ўзорам дасканалай і адзінаправільнай веры. Пільную ўвагу штотыднёвік надаваў пытанням апалагетыкі як асновы абавязковага і пастаяннага місіянерства ў хрысціянскай традыцыі ў барацьбе з хмарамі політэізма (множнасць багоў) і са спрошчанасцю пантэізму (бажаства ў кожнай рэчы). Ужо ў першы год выдання аўтар часопіснага артыкула раскрывае вытокі апалогіі хрысціянства, якія пачынаюцца адразу з яго ўзнікненнем. Дагматычна гэта праяўляецца ў словах Хрыста: «Мяне перасьледавалі і вас перасьледаваць будуць». Пачынальнікам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

апалогіі хрысціянства быў «першапачатковы яго перасьледчык жыд з м. Tarsu, пасьля ён апостал народаў Сьв. Павел, самы дзейны, найбольш чынны з усіх апосталаў» [1, с. 3]. Аўтар публікацыі звяртае ўвагу, што апостал Павел, ідучы змагацца з праціўнікам сваім, нібыта яму кажа: «Якім аружжам ваюеш, ад гэтага і згінеш!» «Проціў цябе зьвярну тваю біблію, проціў цябе зьвярну твой розум» [1, с. 3]. Гаворка тут ідзе аб двух варожых супраць хрысціянства ідэалогіях: іўдаізме і рымскім праве, якія паставілі новай рэлігіі сваё veto, сваю забарону. Іўдаізм не прызнаваў хрысціянства як сусветную рэлігію, так як яна адмаўляла богаабранасць яўрэйскага народа; рымскі ўрад імкнуўся адмовіць хрысціянства з пазіцый логікі Рымскага права, а рымскае грамадзянства непрымальна адносілася да хрысціянства з пазіцый сваёй паганскай веры.

Ключавой задачай хрысціянскай тэорыі пазнання ў цэлым з'яўляецца выяўленне такой універсальнай лагічнай формы, якая б адначасова ў адным акце думкі «схоплівала» б завершаную, створаную, смяротную сутнасць любых з'яваў гэтага свету і сведчыла б аб быцці вечным, нестворaным (боскім). Менавіта гэтым палажэннем кіраваўся і аўтарскі калектыў часопіса ў асэнсаванні не толькі рэлігійнай і філасофскай праблематыкі, але і ў пытаннях выхавання нацыянальнай самасвядомасці, аналізу гаспадарчага жыцця, сямейных і побытавых адносін і г. д. Вызначаючы два шляхі спасціжэння ісціны, часопіс паслядоўна, з пазіцый нэатамізму, адстойваў вяршэнства веры над розумам, так як «сама веда без божага маральнага апякунства і ўзгадавання – гэта востры меч у руках дзікага разбойніка» [4, с. 2]. Абмежаванасць розуму ў пазнанні прадвызначаецца звышгістарычнымі падзеямі, боскім будаўніцтвам як неразгаданай таямніцай, і таму чалавечае пазнанне – абмежаванае, а шляхі божыя – не шляхі людскія. Адначасова гэта не выключае, але абавязкова дапускае прысутнасць у гісторыі чалавека, якія здольны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэалізаваць сваю свабоду ў пытаннях пазнання. І гэта адбываецца таму, што толькі праз Хрыста як адзінага і дасканалага пасярэдніка, які злучае чалавека з Богам, магчыма спасціжэнне шляхоў і спраў людскіх. Аўтар артыкула «Бог» з філасофскіх падыходаў павучальна тлумачыць, што чалавек заўсёды аб усім судзіць па сабе і дзеля гэтага хоча і Бога «локцем людскім мерацъ» [2, с. 3], гэта значыць прыпісванне Богу чалавечых форм, як гэта робіцца ва ўсіх паганскіх рэлігіях.

У часопісе часта прысутнічае спалучэнне свецкіх і рэлігійных жанраў, субкультурнай тэматыкі, цікавай для шырокай, разнапланавай грамадскасці. Гэты пераход забяспечваў камунікатыўную сустрэчу чытача з нязвыклымі яму матэрыяламі, дапамагаў аблегчыць іх успрыняццё. Напрыклад, каб данесці да чытача з пазіцый хрысціянства крытычнае разуменне катэгорыі «матэрыя», часопіс прапаноўваў варыянты аналізу прыродных і сацыяльных праблем з боку адукаванасці і неадукаванасці чалавека. Паводле «Хрысціянскай думкі» неадукаваны чалавек захапляецца трыумфальным бегам нашага стагоддзя, а адукаваны чалавек высачыць у гэтым часе хаос думак, бязладдзе грамадскага розуму, неабмежаваныя жаданні, балючыя стогны ці зласесны гнеў. Прычына ўсяго гэтага, паводле часопіса, відавочная: «сяньня з жыцьцёвага, грамадскага сьветагляду зусім адкідваецца Сьветаўладны, Усямудры Агляд Бога, а на месца яго падстаўляецца вечная матэрыя, праз каторую чалавек стаўся сьляпой механічнай сілай, каторая сама ня ведае, адкуль і куды ідзе, каторая ня ведае сэнсу свайго існаваньня, згубіла толк і зрабілася ахвяраю вялікае, трагічнае бязталковасьці» [5, с. 5]. Больш за ўсё публікацый «Хрысціянскай думкі» скіравана на інфармаванне чытачоў аб касцельным жыцці, аб падзеях і фактах адносна каталіцкага жыцця, якія закранаюць пытанні асветніцтва, фармавання беларускай нацыянальнай свядомасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гістарычная рэальнасць у «Хрысціянскай думцы» зводзіцца да тэксту (Бібліі) і ўяўлення гісторыі як мноства вербальных, павествавальна сканструяваных мадэляў «мінуўшчыны» ўсяго Усясвету і гісторыі Беларусі ў прыватнасці. Пачынаючы ад першага нумара ў часопісе змяшчалася рубрыка аб пабожнасці чалавека. Напрыклад, у артыкуле «Некалькі слоў аб пабожнасьці» метафарычна сцвярджалася, што нейкі просты чалавек жыў адзін адным у пустыні, добры і справядлівы, але не ўмеў маліцца да Бога, бо ні касцёла, ні ружанца і блізка не было. Ён рана ўставаў і скакаў праз парог гаворачы: «Гэта табе, Божа; а гэта мне, Божа» [3, с. 3]. Святасьць гэтага чалавека заключаецца ў тым, што ён любіў Бога. У гэтым прыкладзе прысутнічае абумоўленасць як у метагістарычным змесце пабожнасці, так і ў наяўнасці тропаў метафары і іроніі, якія выступаюць як ідэнтычныя кагнітыўныя формы свядомасці. Ідучы па лініі асэнсавання пабожнасці, аўтар публікацыі выкарыстоўвае прыём метафарычных выказванняў як моўных механізмаў, якія арганізоўваюць бачанне адных аб’ектаў ў святле другіх, і сродак, які змушае заўважаць нечаканыя аналогіі і падабенствы паміж прадметамі. Такога роду метафары з’яўляюцца неаддымнай часткаю не толькі натуральнай мовы, у якой яны паспяхова выкарыстоўваюцца наперакор іх «неўсвядомленасці», але таксама філасофскага і рэлігійнага дыскурса, якім бы строгім ён не быў. Устаноўка на элімінацыю метафар са строгай (ідэальнай) мовы ўтрымлівае пад сабою аснову, але ў той самы час забараніць іх выкарыстанне – значыць наўмысна абмежаваць здольнасці чалавечага розуму да пошуку і адкрыццяў.

«Хрысціянская думка» з неатамісцкіх пазіцый злучала традыцыйнае для хрысціянства правідэнцыяльна-эсхаталагічнае бачанне грамадскага развіцця, гісторыі і іх аналіза ў святле сучасных праблем. З рэалізацыяй гэтых прынцыпаў беларускія хрысціянскія дэмакраты звязвалі забеспячэнне шматстайнасці форм уласнасці ў Беларусі, прымірэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

супярэчнасцей паміж сацыяльнымі пластамі, групамі і класамі, палітычнага плюралізма, правоў грамадзян, дэмакратычных свабод у злучэнні з прыматам агульначалавечых культурных каштоўнасцей.


*1.* Ahulnaje paniaccie Apolohietyki Chryscijanskaj // Chryscijanskaja Dumka. – Wilnia. – 1928. – 24 krasawika. – № 8.

*2.* Dr. M. A. BOH. Jak pahadzic z boham zlo? // Chryscijanskaja Dumka. – Wilnia. – 1928. – 10 traunia. – № 9.

*3.* I. H. Niekalki slou ab paboznasci // Chryscijanskaja Dumka. – Wilnia. – 1928. – 8 lutaha. – № 3.

*4.* Filozofija ubohaj stajenki // Chryscijanskaja Dumka. – Wilnia. – 1932. – 25 snieznia. – № 12.

*5.* X.P.T. Prauda // Chryscijanskaja Dumka. – Wilnia. – 1928. – 10 traunia. – № 9.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ИЛЛЮСТРИРОВАННАЯ ПОЧТОВАЯ ОТКРЫТКА КАК СРЕДСТВО МЕЖКУЛЬТУРНОГО ВЗАИМОДЕЙСТВИЯ


***К. А. Апанасенко,***

*студент III курса ФКиСДК*

*Белорусского государственного университета культуры и искусств*


Открытка (или открытое письмо) – особый вид почтовой карточки для открытого письма, без конверта [2]. Как культурный феномен открытка имеет большое значение. Исследователями она рассматривается как артефакт прошлого, часть культурного наследия, музейный предмет и, конечно же, средство межкультурной коммуникации [4; 6]. Почтовые открытки помогают восстановить хронологию событий жизни людей, живших много лет назад. Иногда открытка является единственным свидетельством того, как выглядело архитектурное сооружение, произведение искусства до разруше-